Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар БДУКМ
_____ Н.У.Карчэўская
15 сакавіка 2026 г.
Рэгістрацыйны № ВД-6/26-145/ эвуч.

ТУРАПЕРЭЙТЫНГ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

2026

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-03-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.08.2023 № 274, вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

СКЛАДАЛЬНІК:

Д.В.Герасімёнак, загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

Я.Л.Краснова, вядучы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы "Цэнтр сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", кандыдат культуралогіі;

С.А.Пацыенка, дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 9 ад 18.04.2026);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 6 ад 24.06.2026)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Модуль "Тэорыя, гісторыя і арганізацыя турызму" складаецца з вучэбных дысцыплін "Геаграфія турызму", "Гісторыя і арганізацыя турызму", "Турыстычны патэнцыял Беларусі", "Тэорыя турызму", "Менеджмент і маркетынг у турызме", "Тураперэйтынг" і "Эканоміка турызму". Дадзеная вучэбная праграма прызначана для вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Тураперэйтынг".

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Тураперэйтынг" абумоўлена тым, што атрыманне прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў па асновах тураперэйтынгу, прынцыпам арганізацыі, абслугоўвання турыстаў, фарміраванню збытавай сеткі тураператара і прасоўванню турысцкага прадукту, пытанням афармлення турысцкай дакументацыі тураператара і арганізацыі бяспекі турыстаў у падарожжы з'яўляецца неабходнай умовай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне турызму.

Асноўныя *мэты* вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Тураперэйтынг": фарміраванне ў студэнтаў теарэтычных ведаў і практычных навыкаў пра асаблівасці стварэння канкурэнтаздольнага турысцкага прадукту; пашырэнне ведаў асноў тураперэйтынгу – вытворчай дзейнасці турысцкага прадпрыемства па распрацоўцы і рэалізацыі турысцкага прадукта.

Задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Тураперэйтынг":

– прааналізаваць асноўныя паняцці, сутнасць і змест тураперэйтынгу;

– вызначыць спецыфіку тураперэйтынгу на турысцкіх прадпрыемствах Рэспублікі Беларусь;

– вывучыць працэс распрацоўкі, планавання, праектавання і арганізацыі тура;

– азнаёміцца з новымі тэхналогіямі і інавацыямі ў турызме.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны асноўнымі мэтамі прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў выступаюць фарміраванне і развіццё кампетэнцый, заснаваных на гуманітарных ведах, эмацыянальна-каштоўнасным і сацыяльна-творчым вопыце, якія забяспечваюць рашэнне і выкананне грамадзянскіх, сацыяльна-прафесійных, асобасных задач і функцый.

Зместам вучэбнай дысцыпліны прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з вучэбным планам па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і турызм): аналізаваць сучасны стан музейных устаноў Беларусі і замежжа, ацэньваць перспектывы іх далейшага развіцця, у тым ліку

ў сувязі з суб'ектамі турыстычнай індустрыі; выкарыстоўваць сучасныя веды аб культуры і тэндэнцыях яе развіцця ў музейнай, турыстычнай і менеджарскай дзейнасці, ахове культурнай спадчыны, навыкі педагагічнага і аратарскага майстэрства ў яе інтэрпрэтацыі; ствараць інавацыйныя культурныя праекты, укараняць і ацэньваць іх вынікі, распрацоўваць і выкарыстоўваць інавацыйныя тэхналогіі ў музейнай і турыстычнай індустрыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Тураперэйтынг" студэнты павінны *ведаць*:

– сутнасць і нацыянальныя асаблівасці развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь;

– сутнасць і структуру турыстычнай індустрыі, яе дасягненні на сучасным этапе;

умець:

– аналізаваць кампаненты і асаблівасці функцыянавання турыстычнай індустрыі;

– характарызаваць асаблівасці фарміравання і перспектывы развіцця беларускага турызму;

– прымяняць на практыцы тэхналогіі арганізацыі выязнога і ўязнога турызму;

валодаць навыкамі:

– арганізацыі турыстычнай дзейнасці;

– арганізацыі выязнога і ўязнога турызму.

У ходзе адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць асабісты каштоўнасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, які гатовы да актыўнага ўдзелу ў сацыяльна-культурным жыцці краіны.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне "Тураперэйтынг" распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з вучэбнымі праграмамі па вучэбных дысцыплінах "Гісторыя і арганізацыя турызму", "Менеджмент і маркетынг у турызме", "Эканоміка турызму" і іншымі вучэбнымі дысцыплінамі, якія служаць падмуркам у набыцці прафесійных ведаў па спецыяльнасці "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны".

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія мэтазгодна выкарыстоўваць пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны, адносяцца: гісторыка-тэматычны падыход; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; камунікатыўныя тэхналогіі; метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца разнастайныя варыянты самастойнай

работы, вучэбна-метадычныя комплексы. Для правядзення семінарскіх заняткаў варта выкарыстоўваць методыкі актыўнага навучання, метад малых груп, дыскусійныя формы.

У адпаведнасці з вучэбным планам, на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Тураперэйтынг" усяго прадугледжана 90 гадзін, з іх 36 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 26 гадзін, семінарскія заняткі – 10 гадзін.

Форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне, тэсціраванне. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Уводзіны

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны “Тураперэйтынг”. Асноўны паняційна-тэрміналагічны апарат. Тураперэйтынг як від вытворчай дзейнасці турысцкага прадпрыемства па распрацоўцы і рэалізацыі турысцкага прадукта. Функцыі тураперэйтынгу.

Тэма 1. Тур як асноўны прадукт дзейнасці тураператара

Эканамічная сутнасць тура. Тыпы тураў. Сістэма і прынцыпы класіфікацыі тураў. Рэкрэацыйна-аздараўленчыя і экскурсійна-пазнавальныя туры. Індывідуальныя і групавыя туры. Бізнес-турызм. Класіфікацыя тураў. Асаблівасці дзейнасці турысцкага прадпрыемства пры распрацоўцы розных тыпаў тураў. Турысцкі маршрут: паняцце, віды.

Турпакет, сутнасць і паняцце турпакета, яго асноўныя характарыстыкі і кампаненты. Класы абслугоўвання і пакет паслуг. Асноўныя і дадатковыя паслугі, уласныя і партнёрскія паслугі.

Тэма 2. Распрацоўка тураў. Асноўныя этапы тураперэйтынгу

Патрабаванні да арганізацыі тураў, нацыянальныя і міжнародныя рэкамендацыі і стандарты. Забеспячэнне якасці абслугоўвання і бяспекі турыстаў. Гаагская і Манільская дэкларацыі па турызме.

Віды тураперэйтынгу і тураператараў. Асноўныя этапы распрацоўкі тураў і іх характарыстыка. Сутнасць і змест планавання і арганізацыі тураў. Стадыі планавання тураў, мэты і задачы турысцкага прадпрыемства на кожнай з трох стадый планавання. Стадыі арганізацыі тураў, мэты і задачы прадпрыемства на кожнай стадыі.

Тэма 3. Першы этап стадыі планавання тураў (даследаванне і аналіз)

Планаванне тураў. Мэты і задачы планавання тураў. Патрабаванні да планавання тураў.

Асноўныя фактары знешняга і ўнутранага асяроддзя, якія аказваюць уплыў на распрацоўку тураў і іх рэалізацыю. Асноўныя напрамкі вывучэння рынка попыту і прапановы, працэдура ацэнкі і выбар найбольш перспектыўных тураў. Сегментаванне рынку. Крыніцы інфармацыі. Характарыстыка аб’ектаў даследавання: спажыўцы, рынак прапановы, знешняе асяроддзе і пастаўшчыкі. Падыходы да фарміравання задумы будучага тура.

Тэма 4. Другі этап стадыі планавання тураў (фарміраванне комплексу паслуг)

Падыходы, якія прымяняюцца да фарміравання комплексу паслуг. Улік запытаў і запатрабаванняў спажыўцоў турысцкага прадукту. Фарміраванне канкурэнтнай перавагі на рынку. Падбор партнёраў і пастаўшчыкоў паслуг. Асаблівасці правядзення перамоў з партнёрамі і пастаўшчыкамі паслуг. Улік фактараў знешняга асяроддзя. Праграма абслугоўвання. Спецыфіка заключэння дагавораў паміж аўтгоінгавымі і інкамінгавымі тураператарамі. Арганізацыя супрацоўніцтва са страхавымі кампаніямі.

Тэма 5. Трэці этап стадыі планавання тураў (фарміраванне праграмы тура і арганізацыя мерапрыемстваў па стымуляванні збыту)

Завяршальныя мерапрыемствы на стадыі планавання. Падрыхтоўка турпрадукту да масавай рэалізацыі. Мэты і задачы турысцкага прадпрыемства на завяршаючай стадыі планавання тура. Прынцыпы складання каляндарнага графіка на сезон. Мерапрыемствы па стымуляванні збыту новага турпрадукту. Вызначэнне схемы працы тураператара па прасоўванні новага турысцкага прадукту. Падрыхтоўка неабходнай дакументацыі і яе характарыстыка.

Тэма 6. Арганізацыя тура

Асноўныя стадыі арганізацыі тура, мэты і задачы турысцкага прадпрыемства на кожнай стадыі.

Першы этап стадыі арганізацыі тура (падрыхтоўка персаналу да арганізацыі тура). Падрыхтоўка каналаў збыту. Падрыхтоўка персаналу, размеркаванне абавязкаў сярод супрацоўнікаў, трэнінг. Рэалізацыя праграм стымулявання збыту і рэкламная кампанія. Прэзентацыі і пробныя продажы. Карэкціроўка тура.

Другі этап стадыі арганізацыі тура (масавы продаж). Продаж тура. Прамы продаж. Патрабаванні да персаналу. Першасны кантакт з кліентам. Асаблівасці вядзення перамоў. Правілы і стадыі правядзення тэлефонных перамоў. Тэхніка прэзентацыі тура па тэлефоне, параметры ацэнкі праведзеных перамоў. Дагавор з кліентам. Асноўныя палажэнні дагавора. Патрабаванні да афармлення дагавораў з кліентам у залежнасці ад тыпа тура. Абавязкі і правы бакоў. Умовы адмовы ад турысцкай паездкі. Умовы ануляцыі турысцкай паездкі. Адказнасць турысцкага прадпрыемства.

Трэці этап стадыі арганізацыі тур (прадастаўлення абслугоўвання кліентаў па туру). Паслугі па сустрэчы і суправаджэнні. Паслугі гідаў-перакладчыкаў, паслугі суправаджальніка (кіраўніка) групы. Суправаджэнне групы турыстаў. Асаблівасці суправаджэння індывідуальных турыстаў.

Спецыфіка абслугоўвання турыстаў у залежнасці ад тыпа тура. Выкананне праграмы тура. Прадастаўленне дадатковых паслуг, анімацыйнае абслугоўванне. Замежныя прадстаўнікі тураператара.

Стадыя кантролю як заключная стадыя арганізацыі тура. Падыходы да ацэнкі вынікаў дзейнасці турысцкага прадпрыемства па арганізацыі тура. Выяўленне моцных і слабых бакоў. Аналіз работы турысцкага прадпрыемства за сезон. Карэкціроўка дзейнасці на наступны сезон.

Тэма 7. Кіраванне канфліктамі ў тураперэйтынгу

Канфліктныя сітуацыі ў турысцкай паездцы. Урэгуляванне канфліктных сітуацый і іх прадухіленне. Роля суправаджальніка (кіраўніка) групы ў вырашэнні канфліктаў. Непрадбачаныя сітуацыі, страхавыя падзеі, няшчасныя выпадкі, дзеянні суправаджальніка (кіраўніка) групы. Прэтэнзіі турыстаў да турысцкай фірмы, шляхі і спосабы ўрэгулявання прэтэнзій.

Тэма 8. Асаблівасці арганізацыі супрацоўніцтва турыстычнага прадпрыемства з пастаўшчыкамі паслуг

Крытэрыі выбару і ацэнкі партнёраў і пастаўшчыкоў. Асаблівасці супрацоўніцтва са знешнімі тураператарамі і турагентамі. Гатэльны бізнес. Арганізацыя сумеснай работы з гасцініцамі, браніраванне месцаў у гасцініцах, арэнда месцаў у гасцініцах і іншых месцах пражывання. Забеспячэнне паслуг па харчаванні ў рамках тура.

Асаблівасці арганізацыі супрацоўніцтва з транспартнымі прадпрыемствамі. Аўтамабільны і чыгуначны транспарт. Спецыфіка супрацоўніцтва з авіяцыйнымі кампаніямі. Браніраванне авіябілетаў на рэгулярных рэйсах. Чартарныя перавозкі. Асаблівасці арганізацыі круізаў.

Супрацоўніцтва з экскурсійнымі кампаніямі. Арганізацыя супрацоўніцтва са страхавымі кампаніямі. Асноўныя віды страхавання, Візавая падтрымка.

Тэма 9. Новыя тэхналогіі і інавацыі ў турызме

Інавацыі ў турызме. Новыя тэхналогіі, якія прымяняюцца ў тураперэйтынгу. Выкарыстанне праграмнага забеспячэння ў мэтах планавання і арганізацыі тураў. Удасканаленне дакументаабароту. Выкарыстанне магчымасцяў Інтэрнэту. Віртуальныя турысцкія бюро, віртуальныя туры.

Спецыялізаваныя сістэмы, якія выкарыстоўваюцца ў турызме. Сістэмы электроннага браніравання, іх асноўныя характарыстыкі, адрозненні і магчымасці. Сістэмы, якія выкарыстоўваюцца ў беларускім турбізнесе.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін		Колькасць гадзін КСР	Форма кантролю ведаў
		Лекцыі	Семінарскія заняткі		
1	2	3	4	5	6
	Уводзіны	0,5			
1.	Тур як асноўны прадукт дзейнасці тураператара	1,5			
2.	Распрацоўка тураў. Асноўныя этапы тураперэйтынгу	2			
3.	Першы этап стадыі планавання тураў (даследаванне і аналіз)	2	2	2	выбарачнае апытанне, тэставае заданне, мультымедыя прэзентацыя
4.	Другі этап стадыі планавання тураў (фарміраванне комплексу паслуг)	2	2	2	выбарачнае апытанне, тэставае заданне, мультымедыя прэзентацыя
5.	Трэці этап стадыі планавання тураў (фарміраванне праграмы тура і арганізацыя мерапрыемстваў па стымуляванні збыту)	2	2	2	выбарачнае апытанне, тэставае заданне, мультымедыя прэзентацыя
6.	Арганізацыя тура	4	2	2	выбарачнае апытанне, тэставае заданне, мультымедыя прэзентацыя
7.	Кіраванне канфліктамі ў тураперэйтынгу	2			

1	2	3	4	5	6
8.	Асаблівасці арганізацыі супрацоўніцтва турыстычнага прадпрыемства з пастаўшчыкамі паслуг	2			
9.	Новыя тэхналогіі і інавацыі ў турызме	4			
Разам		**22**	**8**	**8**	

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

Літаратура

Асноўная

1. Демьянов, С. А. Туроперейтинг : учебно-методическое пособие / С. А. Демьянов, Г. Р. Потаева. — Пинск : ПолесГУ, 2021. — 100 с. — URL: https://e.lanbook.com/book/314141 (дата обращения: 16.06.2026).

2. Хайретдинова, О. А. Технология и организация туроператорской деятельности : учебное пособие / О. А. Хайретдинова. – Уфа : Уфимский государственный университет экономики и сервиса, 2015. – 107 с. : табл., схем. – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=445129 (дата обращения: 15.05.2026).

Дадатковая

1. Бизнес-планирование в туризме : учебник / О. Н. Васильева, А. В. Казакова, И. А. Меркулина [и др.] ; под общ. ред. Т. В. Харитоновой, А. В. Шарковой ; Финансовый университет при Правительстве Российской Федерации. – 6-е изд. – Москва : Дашков и К°, 2024. – 308 с. : ил., табл., схем. – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=709784 (дата обращения: 16.06.2026).

Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Арганізацыя вучэбнай работы студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне "Тураперэйтынг".

Для дыягностыкі атрыманых студэнтамі ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

– тэставыя заданні па асобных падраздзелах і вучэбнай дысцыпліне ў цэлым;

– пісьмовыя работы па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;

– мультымедыя прэзентацыі па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;

– выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне экзамену.

Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных тэмах вучэбнай дысцыпліны "Тураперэйтынг", вывучэння дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўку да экзамену.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на:

– фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;

– засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;

– развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з'яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення экзамену.

Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны "Тураперэйтынг" рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання студэнтаў: лекцыйныя і семінарскія заняткі, а таксама элементы самастойнай работы.

У лік эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю ў студэнтаў крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; кантэнт-аналізу; праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.